Аўтар: Андрэй Лаўрухін

намеснік прадстаўніка па нацыянальным адраджэнні ў галіне адукацыі і навукі
Аб’яднанага Пераходнага Кабінета Беларусі

**Policy paper**

# «Беларуская адукацыя і навука дыяспаральнымі вачыма: актуальны стан, праблемы і перспектывы»

**чэрвень 2026**

## Рэзюмэ

Актуальны стан беларускай адукацыі і навукі задаецца беспрэцэдэнтнымі для усяго постсавецкага часу выклікамі, якія можна тыпалагізаваць па чатыром колам праблем: 1) (сама)ізаляцыя ад адукацыйных прастор развітых еўрапейскіх краін свету і міжнародных праграм фінансавай падтрымкі сістэмы адукацыі і навукі РБ; 2) каланіЯлізацыя і асіміляцыя сістэмы адукацыі і навукі Беларусі ў адукацыйна-навуковую прастору РФ; 3) дэградацыя, ідэалагізацыя і мілітарызацыя сістэмы адукацыі і навукі Беларусі (знутры краіны); 4) фінансавая і палітычная уразлівасць, раз’яднанасць і дэінстытуцыяналізаванасць навукова-адукацыйных праектаў у эміграцыі. Існуючыя на дадзены момант формы і спосабы адказа на гэтыя выклікі і праблемы не з'яўляюцца задавальняючымі і патрабуюць істотнага крытычнага пераасэнсавання. З трох найбольш імаверных варыянтаў рашэння праблем – «адмена санкцый у абмен на…», «інэрцыйны сцэнар» і «праактыўная парадыгма» – аўтар прапануе засяродзіцца на «праактыўнай парадыгме», якая прадугледжвае яснае і добра абгрунтаванае стратэгічнае бачанне, а таксама прапануе шэраг канкрэтных рэкамендацый па вырашэнню кожнага з чатырох колаў праблем згодна з планам пакрокавай рэалізацыі кожнага з рэкамендаваных рашэнняў.

## Апісанне праблем

Кола найбольш істотных і актуальных праблем беларускай адукацыі і навукі можна умоўна падзяліць на 4 блокі у залежнасці ад масштабаў палітычнага кантэкста (унутрыкраінавага, рэгіянальнага, глабальнага), актараў і тэрытарыяльнага мейсцазнаходжання прадстаўнікоў беларускай адукацыі і навукі (унутры краіны ці у эміграцыі). Ніжэй пералічаны асноўныя праблемы і рызыкі з пазначэннем іх узроўню (каротка-, сярэдне- і доўгатэрміновыя) і размеркаваннем па 4-х блоках з улікам вышэйназваных фактараў. Вылучэнне менавіта такога кола праблем абаснавана як асабістымі шматгадовымі даследваннямі ў гэтай галіне, так і беларускімі і міжнароднымі даследваннямі і маніторынгамі калег, ThinkTanks, а таксаманазіраннямі і маніторынгамі навукова-адукацыйных арганізацый і ініцыятыў унутры краіны і у эміграцыі.

1. **(Сама)ізаляцыя ад адукацыйных прастор развітых еўрапейскіх краін свету і міжнародных праграм фінансавай падтрымкі сістэмы адукацыі і навукі РБ (сімптомы і працягласць дзеяння)**:

- зыход з Беларусі еўрапейскіх адукацыйных інстытутаў і прадстаўніцтваў (прыклад - Інстытута Гётэ, ДААД), якія з'яўляліся медыятарамі/пасярэднікамі паміж беларускай і еўрапейскай адукацыйнай прасторай (*сярэдне- і доўгатэрміновы характар, улічваючы нязменную палітычную абстаноўку, вайну і звязаныя з ёй рызыкі*);
- выключэнне Беларусі ўаднабаковым парадку з Міжнароднай праграмы па ацэнцы адукацыйных дасягненняў вучняў школ (PISA) (МСКА 1-3) (*доўгатэрміновы характар, улічваючы нязменную палітычную абстаноўку, вайну і звязаныя з ёй рызыкі, а таксама інэртнасць агульнаеўрапейскіх арганізацый і працэдурныя цяжкасці адмены санкцый*);

- выключэнне Беларусі ў аднабаковым парадку з маладзёжнага прафесійнага руху WorldSkills International і WorldSkills Belarus (МСКА 4-5) (*доўгатэрміновы характар, улічваючы т.с.*);
- рашэнне Назіральнай групы Балонскага працэсу (BFUG) аб прыпыненні прадстаўніцтва Беларусі ў ЕПВА (МСКА 6-8) (*доўгатэрміновы характар, улічваючы улічваючы т.с.*);
- прыпыненне міжнародных праграм фінансавай падтрымкі рэформаў адукацыі ў Беларусі (прыклад - праграма Сусветнага банка "Праект мадэрнізацыі вышэйшай адукацыі Беларусі 2020-2025" на 109 млн. USD) (*доўгатэрміновы характар, улічваючы улічваючы т.с.*).

2. **КаланіЯлізацыя і асіміляцыя сістэмы адукацыі і навукі Беларусі ў адукацыйна-навуковую прастору РФ (сімптомы і працягласць дзеяння):**

- паступовае увядзенне Нацыянальнага апытання якасці адукацыі (НАЯА) як расейскага эрзаца PISA (на узроўні сярэдняй адукацыі: МСКА 0-3) (*доўгатэрміновы характер, улічваючы выключэнне Беларусі з Міжнароднай праграмы па ацэнцы адукацыйных дасягненняў вучняў школ (PISA) і адсутнасць альтэрнатыў*);
- фінансаванне ўрадам РФ 150 інжынерна-інавацыйных класаў (STEM-класаў) у рамках дзяржаўнай праграмы РОББО (*доўгатэрміновы характар, улічваючы інэрцыю уплыва і тэхнічную залежнасць ад РФ у бліжэйшай будучыні*);
- расейскі эрзац міжнародных праграм на узроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі (МСКА 4-5) (*доўгатэрміновы характер, улічваючы выключэнне Беларусі з міжнароднага маладзёжнага прафесійнага руху WorldSkills International і WorldSkills Belarus і адсутнасць альтэрнатыў*);
- сістэмны рэкрутынг беларускіх выпускнікоў ў вузы Расійскай Федэрацыі (МСКА 6-8) (*сярэдне- і доўгатэрміновы характер, улічваючы дэмаграфічныя праблемы у РФ, адносную аўтаномію універсітэтаў па пытаннях рэкрутынгу студэнтаў і адсутнасць абмежаванняў рэкрутынгу з боку беларускіх уладаў*);
- увядзенне ЦЭ як аналага расійскага АДЭ і аблегчанай працэдуры паступлення ў расійскія ВНУ (*доўгатэрміновы характар, бо закрэплены на узроўні securityзаканадаўства і шырока уведзены у практыку ва усёй сістёме адукцыі Беларусі*);
- 17-разовы рост квотаў на бюджэтныя месцы для беларусаў у ВНУ РФ (*сярэднетэрміновы характар і залежыць ад эканамічнага стану РФ ва умовах вядзення вайны супраць Украіны*);
- індактрынацыя ўсіх удзельнікаў сістэмы адукацыі РБ ідэалагемамі «рускага свету»: імпарт расейскай ідэалогіі ва ўмовах дэфіцыту «беларускай» ідэалогіі (*каротка- і сярэднетэрміновы характар)*;
- увядзенне з 2024 года інструмента адукацыйных грантаў для беларусаў; пашырэнне сеткі расійскіх навуковых і адукацыйных інстытутаў і прадстаўніцтваў у Беларусі (*каротка- і сярэднетэрміновы характар і залежыць ад эканамічнага стану РФ ва умовах вядзення вайны супраць Украіны*).

3. **Дэградацыя, ідэалагізацыя і мілітарызацыя сістэмы адукацыі і навукі Беларусі (знутры краіны) (сімптомы і працягласць дзеяння):**

- заканадаўчае замацаванне і легітымацыя больш радыкальных і жорсткіх форм дзяржкантролю за дзейнасцю адукацыйных установ (Кодэкс аб адукацыі 2022) (*доўгатэрміновы характар*);

- узмацненне жорсткасці кантролю за акадэмічным жыццём і мабілізацыя рэпрэсіўных інстытутаў і механізмаў па выяўленні іншадумства, «чысткі шэрагаў», запуск механізмаў інтэрпеляцыі і інш. (*сярэднетэрміновы характар*);
- вымыванне прафесійных, але не лаяльных кадраў (карэлятыўна - зніжэнне якасці адукацыі) (*доўгатэрміновы характар*);
- масавы зыход навучэнцаў сістэмы адукацыі РБ (яркі прыклад – недабор ў 2023-2024 нав. г. 6000 патэнцыйных студэнтаў у ВНУ краіны, у тым ліку больш за 500 – на бюджэтныя месцы) (*незваротны характар*);
- разбурэнне ўнутрыкраінавай інфраструктуры НДА, якая рэпрэзентуе, лабіруе і рэалізуе альтэрнатыўныя афіцыйным (еўрапейскія) адукацыйныя праекты і практыкі (*сярэднетэрміновы характар*);
- блакаванне (цэнзурай, наглядам і магчымымі санкцыямі, аж да крымінальных) паўнавартаснай камунікацыі паміж актарамі сферы адукацыі (выкладчыкамі, навучэнцамі, прадстаўнікамі адміністрацыі) унутры краіны і за яе межамі (беларуская дыяспара) (*сярэднетэрміновы характар*).

4. **Фінансавая і палітычная уразлівасць, раз’яднанасць і дэінстытуцыяналізаванасць навукова-адукацыйных праектаў дыяспары (сімптомы і працягласць дзеяння):**

- кароткатэрміновае фінансаванне пераважна за кошт грантаў не дае магчымасцяў быць упэўненымі нават ў сярэднятэрміновай перспектыве;
- змяненне палітычнай атмасферы пасля 2022г., больш строгія нормы заканадаўства ў адносінах да адукацыйных устаноў на беларускай мове і палітычная валатыльнасць ва умовах вайны не дазваляе планаваць развіццё праектаў нават ў сярэднятэтрміновай перспектыве – дамінуе устаноўка на выжыванне, а не на развіццё;
- арганізацыі і ініцыятывы ўзніклі як адказ на канкрэтны выклік, запыт мэтавай аўдыторыі → няма стратэгічнага бачання развіцця праектаў;
- ініцыятары адукацыйна-навуковых праектаў дрэнна ведаюць адзін аднаго і ва умовах пагаршэння фінансавання, разглядаюць адзін аднаго як канкурэнтаў за рэсурсы, а не як партнэраў;
- шмат ініцыятыў (пераважна новых) не маюць інстытуцыянальнага «даха» і таму пазбаўлены магчымасцяў атрымаць адпаведную фінансавую дапамогу;
- моладзь у еўрапейскіх краінах мае пэўныя перашкоды і абмежаваннії пры паступленні у еўрапейскія вышэйшыя навучальныя установы (прыклад увядзення новых умоў сдачы моўнага экзамена ў ліпені 2025 года у Польшчы).

## Наступствы бяздзейнасці

У выпадку, калі не будуць сур'ёзна ўспрыняты гэтыя выклікі і распрацаваны адпаведныя шляхі і эфектыўныя сродкі вырашэння пазначаных праблем, магчымы такія негатыўныя наступствы:

1) Працяг і узмацненне тэндэнцыі (сама)ізаляцыі Беларусі прывядзе да адрыву краіны ад сусветнай адукацыйна-навуковай прасторы, поўнаму спыненню акадэмічных абменаў, страце доступу да міжнародных баз дадзеных і масаваму адтоку кваліфікаваных спецыялістаў, у выніку чаго краіна апынецца у інтэлектуальнай стагнацыі і забяспечыць сябе на дзесяцігоддзі наперад эканамічную, сацыяльную, палітычную і культурную дэградацыю.
2) Ва ўмовах падвойнай ізаляцыі (уладамі Беларусі і еўрапейскімі краінамі) уплыў Расіі на адукацыю і навуку Беларусі павольна становіцца безальтэрнатыўным і

дамінуючым на усіх узроўнях: фінансавым, заканадаўчым, кадравым і змястоўным (уплыў акадэмічных і навукова-тэхнічных школ, змест навучальных праграм, ідэалогіі, адукацыйнай палітыкі і г.д.). Працяг гэтай тэндэнцыі можа прывесці да асіміляцыі беларускай навукава-адукацыйнай сістэмы ў адукацыйна-навуковую простору РФ.

3) Выключэнне Беларусі з сусветнай адукацыйна-навуковой прасторы і асіміляцыя ў расейскую прастору паскорыць дэградацыю і мілітарызацыю сістэмы беларускай адукацыі і навукі, што прывядзе да інтэлектуальнай стагнацыі, зніжэнню якасці жыцця, страты геапалітычнай вагі і ператварэння Беларусі ў ізгоя або у прыдатак РФ.
4) У выпадку працяга і узмацнення існуючых негатыўных тэндэнцый фінансавай і палітычнай уразлівасці, раз'яднанасці і дэінстытуцыяналізаванасці навукова-адукацыйных праектаў у беларусскай эміграцыі ёсць пэўная рызыка страціць чалавечы капітал беларускага замежжа у бліжэйшыя 2-3 гады: у выніку даўншыфтынгу высокакваліфікаваныя беларускі і беларусы сыйдуць з прафесіі і незваротна перанакіруюцца на стратэгію асіміляцыі у краінах пражывання, то бок ня будуць бачыць сябе ў якасці "агентаў перамен" ў Беларусі.

## Аналіз бягучай сітуацыі у адукацыйнай і навуковай "палітыцы"

Улічваючы мейсцазнаходжанне Прадстаўніцтва (за межамі Беларусі) і магчымасці уздзеяння (на беларускую дыяспару, еўрапейскіх, амерыканскіх і іншых палітыкаў дэмакратычных краін свету), у фокусе увагі дадзенага policy paper – аналіз бягучай сітуацыі у адукацыйнай і навуковай супольнасці беларускай эміграцыі. Гэта азначае наяўнасць пэўных абмежаванняў. Перш за ўсё, мы наўмысна пазбягаем тут выкарыстанне звычайнага тэрміну "навукова-адукацыйная палітыка" (або ужываем яго у двухкоссях), бо пэўныя абмежаванні дыяспаральнага існавання не дазваляюць мець адпаведную палітычную прастору са звычайнымі ("нармальнымі") для краіны інстытутамі распрацоўкі і імплементацыі навукова-адукцыйнай палітыкі. Другім істотным абмежаваннем з'яўляецца маргінальнае паладжэнне навукова-адукацыйных праблем у павестцы дня беларускага дэмакратычнага руху. Тым ня меньш, нават у вельмі складаных умовах дыяспаральнага існавання беларускамі і беларусамі быў створан шэраг навукова-адукацыйных праектаў і ініцыятыў, інстытутаў прадстаўніцтва беларускай акадэмічнай супольнасці (Беларуская асацыяцыя адукацыі і навукі і інш.), а таксама інстытутаў беларускага дэмакратычнага руху (Офіс Святланы Ціханоўскай, АПК і Прадстаўніцтва па адраджэнню беларускай адукацыі і навукі, Каардынацыйная Рада і інш.), якія выконваюць ролю палітычных прота-суб'ектаў з адказнасцю за правядзенне навукова-адуацыйнай прота-палітыкі. У межах гэтых праектаў, ініцыятыў, органаў самакіравання і палітычных інстытутаў трэба вызначыць 5 найбольш істотных і дасягальных накірункаў дзейнасці: 1) падтрымка і развіццё дыяспаральных адукацыйных і навуковых праектаў, 2) абарона і лабіяванне інтарэсаў беларускіх навучэнцаў, адукатараў і навукоўцаў, 3) уплыў на палітыку дэмакратычных краін свету па накірунку навукова-адукацыйных стасункаў з недзяржаўнай (грамадскай) Беларуссю, 4) правядзенне даследванняў і маніторынгаў стану адукацыі і навукі унутры Беларусі і ў свеце і 5) распрацоўка праектаў рэформ сістэмы адукацыі і навукі для будучай дэмакратычнай Беларусі.

*1-3) Падтрымка і развіццё дыяспаральных адукацыйных і навуковых праектаў.*
*Абарона і лабіяванне інтарэсаў беларускіх навучэнцаў, адукатараў і навукоўцаў.*

*Уплыў на палітыку дэмакратычных краін свету па накірунку навукова-адукацыйных стасункаў з недзяржаўнай (грамадскай) Беларуссю.*

На дадзены момант (чэрвень 2026г.) сярод дыяспаральных структур, якія маюць палітычны вес, аўтарытэт у дыяспаральнай акадэмічнай супольнасці і адукацыйна-навуковыя пытанні ў сваёй павестцы, можна вызначыць наступныя:
1) Офіс Ціханоўскай: інстытут дарадцы Святланы Ціханоўскай па навуцы і адукацыі (Вольга Шпарага (лістапад 2020–кастрычнік 2021), Таццяна Шчытцова (лістапад 2021- жнівень 2025), Павал Церашковіч (верасень 2025- па сёняшні дзень).
2) Аб’яднаны пераходны кабінет: інстытут намесніка Намеснік прадстаўніка па нацыянальным адраджэнні ў галіне адукацыі і навукі (Андрэй Лаўрухін (10 жніўня 2025 – па сёнешні дзень)).
3) Беларуская асацыяцыя адукацыі і навукі (створана ў 2022 г., старшыня – П. Церашковіч).
4) Цэнтр Беларускай Салідарнасці (ЦБС).

Найбольш буйнымі фондамі, якія мэтанакіравана падтрымліваюць беларускія адукацыйныя і навуковыя праекты, зяўляюцца:

1) EU4Belarus — SALT (Support for Advanced Learning and Training).
2) Праграма імя Кастуся Каліноўскага (Польшча).
3) Платформа EdTech4BY (дае магчымасць незалежным аўтарам кантэнту, выкладчыкам і навукоўцам у эміграцыі размяшчаць свае анлайн-курсы, весці лекцыі і атрымліваць за гэта інстытуцыйную падтрымку).
4) Стыпендыя імя Стэфана Банаха (Польшча) (бясплатнае навучанне ў магістратуры польскіх дзяржаўных ВНУ для грамадзян краін Усходняга партнёрства (уключаючы Беларусь) па інжынерных, тэхнічных, прыродазнаўчых і сацыяльных навуках).
5) Вышаградскі фонд (Visegrad Scholarship Program) (стыпендыі для магістрантаў і аспірантаў для навучання ў краінах Вышаградскай чацвёркі (Польшча, Чэхія, Славакія, Венгрыя)).
6) Праграма Philipp Schwartz Initiative (Германія) (гранты для навукоўцаў, якія сутыкнуліся з пагрозай рэпрэсій або пераследу ў сваіх краінах. Дазваляе працягнуць даследчую працу ў нямецкіх універсітэтах на тэрмін да 24 месяцаў).
7) Scholars at Risk (SAR) (міжнародная сетка абароны правоў навукоўцаў. Дапамагае выкладчыкам і даследчыкам, якія вымушаны пакінуць Беларусь, знайсці часовыя акадэмічныя пазіцыі, стажыроўкі і працу ў ВНУ Еўропы і ЗША).
8) Chances for Science (Германія) (платфарма для навукоўцаў-уцекачоў і акадэмікаў у эміграцыі, якая дапамагае інтэгравацца ў нямецкую навуковую супольнасць і знайсці сумесныя даследчыя праекты).
9) Science at Risk (Германія) (проект организации Akademisches Netzwerk Osteuropa (akno e.V.), направленный на поддержку ученых и студентов, пострадавших от войны в Украине или политических репрессий в Беларуси и России).
10) Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт (ЕГУ, Вільнюс) (беларускі ўніверсітэт у эміграцыі згодна са сваёй місіяй мусіць рэгулярна прапанаваць акадэмічныя вакансіі, даследчыя гранты і праграмы перападрыхтоўкі для звольненых па палітычных матывах беларускіх выкладчыкаў).
11) Ініцыятыва Bright Belarus (ментарская і экспертная падтрымка беларускіх школьнікаў і студэнтаў пры паступленні ў топ-універсітэты свету, у тым ліку дапамога ў атрыманні поўных стыпендый (financial aid)).

Негледзячы на наяўнасць азначаных арганізацый, фондаў і праграм, узровень і маштаб падтрымкі нельга назваць дастатковым з шэрагу прычын. *Перш за ўсё*, трэба адзначыць нізкую інфармаванасць патэнцыйных атрымальнікаў падтрымкі. Гэта звязўана як з дрэннай камунікацыей паміж грантадаўцамі і атрымальнікмі дапамогі, так і з актарамі у самой эміграцыі (палітычнага, градаскага і акадэмічна-навуковага узроўняў). *Па-другое*, не усе з вышэй адзначаных суб'ектаў вытрымліваюць прапісаныя у місіі мэты і задачы: напрыклад, ЭГУ амаль не мае курсаў на беларускай мове, але мае "чорны спіс" нелаяльных адміністрацыі беларускіх выкладчыкаў і навукоўцаў, падтрымліваючы пры гэтым шэраг расейскіх выкладчыкаў і навукоўцаў. У выніку абвяшчэння ЭГУ экстрэмістскай арганізацыяй у 2026г. акрамя "выбракоўкі" беларускіх навукоўцаў і выкладчыкаў ёсць пэўная рызыка па выніках набора страціць і беларускіх студэнтаў, такім чынам паставіўшы пад пытанне выкананне заяўленай місіі як такой. *Па-трэцяе*, значная частка сродкаў не дасягае адрасатаў, а застаецца на адміністраванне саміх праектаў і праграм падтрымкі беларусаў. *Па-чацвертае*, пасля пачатка вайны ва Украіне значна скараціліся сродкі фінансавай падтрымкі беларускай моладзі (красамоўны прыклад – праграма імя Каліноўскага) і сталі больш складанымі умовы для паступлення у еўрапейскія вузы (напрыклад, пагоршыліся умовы паступлення у польскія вузы у сувязі з увядзеннем больш строгіх экзаменаў па мове, па ранейшаму патрабуецца апастыль дакументаў аб сканчэнні навучальных устаноў ў Беларусі пры паступленні і г.д.). Не у апошнюю чаргу усе гэтыя хібы звязаны з недастаткова салідарнай і рашучай дзейнасцю палітычных і грамадзянскіх арганізацый і структур беларускай эміграцыі, а таксама нізкім уплывам на палітыку дэмакратычных краін свету па накірунку навукова-адукацыйных стасункаў з недзяржаўнай (грамадскай) Беларуссю.

### 4-5) *Правядзенне даследванняў і маніторынгаў стану адукацыі і навукі унутры Беларусі і ў свеце. Распрацоўка праектаў рэформ сістэмы адукацыі і навукі для будучай дэмакратычнай Беларусі*

Больш паспяховым на гэтым фоне выглядае навукова-даследчая, маніторынгавая і праектыўная дзейнасць. За апошнія 5,5 гадоў быў праведзены шэраг даследванняў стану, праблем і перспектыў развіцця беларускай адукацыі і навукі як у краіне, так і ў эміграцыі, а таксама падрыхтаваныя праекты рэформ на выпадак з'яўлення "акна магчымасцяў". Сярод суб'ектаў, якія сістэматычна займаліся і займаюцца навукова-даследчай, маніторынгавая і праектыўная дзейнасцю можна выдзяліць:

- Офіс па адукацыі для Новай Беларусі (да 2022 года).
- Платформы грамадзянскага дыялогу: "Банк Ідэй", "Новая Беларусь","За Беларусь".
- Грамадзянскія і адукацыйныя ініцыятывы і арганізацыі: "Беларуская адукацыя на шляху перамен", "ЕўраБеларусь", "Беларуская асацыяцыя адукацыі і навукі".
- Think Tanks: Інстытут развіцця і сацыяльнага рынку для Беларус і Усходняй Еўропы (IDSMbee), "Палітычная сфера".
- Палітычныя партыі: Беларускі народны фронт (БНФ), Грамада, Зялёныя, Беларускія хрысціянскія дэмакраты (БХД).

На падставе праведзенага аналіза можна вылучыць два падыходы да стварэння праектаў рэформ:

- *Скіраваныя на поўную перабудову адукацыйнай сістэмы ("Офіс па адукацыі", "Беларуская адукацыя на шляху перамен", IDSMbee, "Новая Беларусь").* Такія праекты базуюцца на тым, што сістэма адукацыі патрабуе радыкальных зменаў.

Пры гэтым для праектавання варта выбудаваць працэс дыялога розных зацікаўленых груп. Праектныя групы канцэнтруюцца не столькі на выбудову дакладнага бачання рэформ тут і зараз, а на працэсе падрыхтоўкі рэформ. Аксіяматычнымі можна лічыць толькі дэідэалагізацыю і дэбюракратызацыю, хуткія крокі па наданні большай аўтаноміі ВНУ праз выбарнасць рэктараў. Хаця імпліцытна гэтыя ж праектныя групы закладаюць прынцыпы інтэграцыі ў міжнародную прастору праз рамачныя дакументы (інклюзія, навучанне цягам жыцця, лічбавая трансфармацыя, рэформа кіравання адукацыяй і інш.). Перавага такога падыхода ў тым, што ён ўлічвае неабходнасць дэмакратычнага дыялога пры правядзенні рэформ. Аднак зваротны бок у тым, што не дае канкрэтнай візіі шырокай аўдыторыі, бо яна мусіць быць выпрацавана сумесна на наступным кроку.

- *Скіраваныя на асобныя змены ў сістэме ("За Беларусь", ГБК, Банк ідэй).* У дадзеным выпадку праектныя каманды і эксперты працуюць часцей з дзяржаўным Кодэксам па адукацыі і з існуючай мадэляй кіравання адукацыяй, прапаноўваючы канкрэнтныя спецыяльныя змены. Частка з іх значна адрозніваецца ад дзяржаўнага курса (напрыклад, моўная палітыка, палітыка ў накірунку прыватнай адукацыі) і патрабуе значнай перабудовы адукацыйнай сістэмы. Аднак канцэптуальна гаворка ідзе пра змену пэўных накірункаў развіцця, а не пра радыкальную перабудову ўсёй сістэмы.

У якасці **праблемных зон** у альтэрнатыўных (эмігрантскіх) праектах рэформ можна вылучыць наступныя:
*Праекты рэформ не надта запатрабаваныя і нябачныя для шырокага кола грамадства.* Акрамя нізкай матывацыі з прычыны сфакусаванасці падаўляльнай большасці выкладчыкаў і днавукоўцаў у эміграцыі на выжыванні, гэта можна патлумачыць складанасцямі абмена інфармацыяй паміж праектнымі камандамі і грамадскасцю, рызыкай рэпрэсій пры ўдзеле ў рэфармаванні, размеркаванасцю праектных каманд па розных краіных. Аднак можна і канстатаваць праблемы пабудовы дыялога па-за межамі экспертнага колу з боку адукацыйных актараў. Можна заўважыць, калі сканчаецца дзейнасць ў межах праекта, то спыняецца публічная дзейнасць ініцыятывы. Некаторыя сайты з'яўляюцца недасяжнымі, для некаторых праектаў няма сайтаў, акрамя старонак у сацыяльных сетках. З аднаго боку, гэта можа быць звязана з блакіроўкамі даменаў і сервераў. З іншага, даволі індыферэнтным стаўленнем ініцыятыў да знешней камунікацыі.
*Адсутнасць дыялогу.* Хаця механізмы абмеркавання праектаў рэформ закладзеныя тэхнічна, грамадская дыскусія выглядае замарожанай. На сайтах грамадзянскіх пляцовак няма каментароў пад рэформамі, прапануецца звычайна толькі адзін варыянт рэформ без зваротнай сувязі. Публічныя дыскусіі магчымыя толькі па-за межамі Беларусі.
*Неразвітасць палітычнага поля.* Калі ўлічваць не працэсныя, а змястоўныя прапановы, то можна казаць, што ў публічным полі прадстаўлены толькі дзве сістэмна апісаныя праграмы рэформ. Адна з із больш схіляецца да правага ліберальнага накірунку, другую можна ахарактэрызаваць хутчэй як лева-цэнтрыстскую. Аднак тая роля, якую ў развітых дэмакратыях граюць партыі ў тлумачэнні і адвакаванні сваіх прапаноў, застаецца незадзейнічанай. Гэта прыводзіць да таго, што няма значнага выбару праектных прапаноў і ўключаннасці розных груп зацікаўленых у дыскусію.

## Варыянты (сцэнары) рашэнняў праблем

Улічваючы наяўныя тэндэнцыі, ініцыятывы найбольш выбітных актараў беларускай палітычнай эміграцыі і магчымы сбег абставін, высакоімаверныя тры варыянты (сцэнары) рашэнняў вышэйузгаданых праблем.

*Сцэнар "зняццё санкцый у абмен на ..."*

Гэты варыянт абапіраецца на канстатаванне пэўных хібаў рэалізацыіі палітыкі санкцый, якая наносіць шкоду не толкі (і нават не столькі) рэжыму Лукашэнкі, сколькі сістэме адукацыі і навукі, а таксама вучням, студэнтам, выкладчыкам і вучоным, абмяжоўваючы іх акадэмічную мабільнасць і ізалюючы сістэму адукацыі і навукі Беларусі ад развітых дэмакратычных краін свету. Аргументацыя гэтай пазіцыі таксама выкарыстоўвае бясспрэчныя факты паступовай і усё больш глыбокай інтэграцыі беларускай адукацыі і навукі у расейскую навукова-адукацыйную прастору ва умовах адсутнасці альтэрнатызнага вектара развіцця і узаемадзеяння з развітымі краінамі Захада. У межах гэтай стратэгіі прапануецца ісці шляхам торга з рэжымам: абмяняць адмену санкцый на адмену забарон і пераследу прадстаўнікоў акадэмічнай супольнасці, дазвол свабоднай акадэмічнай мабільнасці, спыненне перасленду за іншадумства, адмену ідэялогіі і г.д. Гэта стратэгія мае сваю рацыю, але і пэўныя абмежаванні і хібы. Перш за ўсё, далёка не відавочна, што рэжым пойдзе на такі абмен і, што яшчэ больш істотна, у поўнай меры і адказна рэалізуе свае абяцанні. Калі усё грамадства знаходзіцца у жорсткіх умовах тэрора і татальнага кантроля, высвабадзіць з яго акадэмічна-навуковую частку и даць пэщныя правы и свабоды наўпрост немагчыма. Хутчэй за усё, рэжым абмяняе на адмену санкцый больш ці меньш вытанчаную імітацыю паслаблення абмежаваняў, забарон і пераследу грамадзян, якія знаходзяцца у дзяржаўнай сістэме адукацыі і навукі. У адсутнасць магчымасцяў легальна весці маніторынг забеспячэння правоў грамадзян Беларусі на адукацыю гэты варыянт можа стаць чарговым жульніцтвам з боку рэжыму і адначасова, будзе выкарыстаны рэжымам у якасці інструмента сваёй легітымізацыі у вачах света (у тым ліку дэмакратычнага). Такім чынам рэпрэсіі у сістэме адуацыі і навукі будуць мець статус "прымальнага кошту" за імавернае "акно у Еўропу".

*Інэрцыйны сцэнар*

Гэты варыянт абапіраецца на канстатацыю сбега абставінаў няўхільнай сілы: немагчыма ані зрынуць рэжым, ані таргаваць з ім і таму трэба даць часу, санкцыям і негатыўным тэндэнцыям унутры краіны стварыць сваю справу, каб атрымалась пэўная эрозія рэжыму і ён істотна саслабеў. Аднак гэтая перадумова мае хісткую падставу: калі на працягу некалькіх гадоў у выніку санкцыяў і раней ажыцьцяўлянай палітыкі ўстойлівасьць і рэпрэсіўнасьць рэжыму толькі нарастала, незразумела, чаму з цягам часу і пры дзеяньні тых жа фактараў можа адбыцца нешта прынцыпова адрознае ад раней атрыманых вынікаў. Сам па сабе час працуе на ўкараненне, рутынізацыю і нармалізацыю рэпрэсіўных практык рэжыму: чым даўжэй яны здзяйсняюцца, тым больш грамадзяне прывыкаюць да іх і лічаць нармальным ходам рэчаў. Таму інэрцыйны сцэнар утрымлівае ў сабе пагрозу фарміравання ўстойлівых і паўтаральных сацыяльных звычак, якія будуць укараняцца ў тканіне сацыяльнага і паўсядзённага жыцця і паўторацца нават у выпадку зыходу дыктатара.

*Праактыўная парадыгма*

Гэты варыянт прадугледжвае больш прынцыповую і паслядоўную пазіцыю у дачыненні да рэжыму, з аднога боку, а з другога - праактыўную пазіцыю, якая звязана з канкрэтнымі дзеяннямі па падвышэнню вагі і жыццяздольнасці прадэмакратычнай акадэмічнай і навуковай супольнасці як унутры краіны, так і за яе межамі (у эміграцыі). Такая тактыка дазваляе выпрацоўваць рэзістэнтнасць у прадстаўнікоў навукова-акадэмічнай супольнасці (да цяжкіх умоў існавання у эміграцыі і рэпрэсій і кантролю унутры краіны), а таксама трымаць сам рэжым у напруджаным стане і паслядоўна паслабляць яго. Канкрэтнае і дэталёвае тлумачэнне сутнасці гэтага варыянта дадзена ніжэй (гл. “Рэкамендацыі”).

## Рэкамендацыі

Прапанаваныя ніжэй рэкамендацыі зарыентаваны на вырашэнне чатырох вышэй узгаданых праблем (гл. “Апісанне праблем”), з улікам усіх плюсаў і мінусаў альтэрнатыўных варыянтаў (сцэнароў) іх рашэння.

1) **Прапановы да рашэння праблемы (сама)ізаляцыі ад адукацыйных прастор развітых еўрапейскіх краін свету і міжнародных праграм фінансавай падтрымкі сістэмы адукацыі і навукі РБ.**

Паколькі у дадзены момант немагчыма уплываць на працэс самаізаляцыі Беларусі ад еўрапейскага света, трэба засяродзіцца на стварэнні альтэрнатыўнага прадстаўніцтва беларускай адукацыі і навукі на міжнародным узроўні ад імя грамадзянскай супольнасці і дэмакратычнага руха, а менавіта:

- ✓ ў Балонскім працэсе (на узроўні вышэйшай школы, МСКА 6-8) – гэта дазволіць выкарыстоўваць публічную пляцоўку рэгулярных урадавых і міністэрскіх сустрэч ў рамках Балонскага працэсу для адвакацыі беларускіх студэнтаў, выкладчыкаў і навукоўцаў, якія падзяляюць еўрапескія каштоўнасці, акадэмічныя свабоды і прытрымліваюцца іх на практыцы;
- ✓ ў маладзёжным прафесійным руху WorldSkills International і WorldSkills Belarus (на узроўні прафесійнай адукацыі МСКА 4-5) – лабіяванне удзелу навучэнцаў ПТА як прадстаўнікоў дэмакратычнай грамадзянскай супольнасці;
- ✓ Ў Міжнароднай праграмы па ацэнцы адукацыйных дасягненняў вучняў школ (PISA) (МСКА 1-3) – праз абмежаваны маніторынг (задача – стварэнне/карэкцыя метадалогіі дыстанцыйнай эвалюацыі);
- ✓ лабіяванне ў міжнародных фондах падтрымкі альтэрнатыўнай беларускай адукацыі і навукі, якая прытрымліваецца еўрапейскіх каштоўнасцяў.

2) **Прапановы да рашэння праблемы каланіЯлізацыі і частковай асіміляцыі сістэмы адукацыі і навукі Беларусі ў адукацыйна-навуковую прастору РФ:**

- ✓ прыярэтызаваць і падтрымліваць адукацыйныя і навуковыя праекты, мэта якіх - перманентны крытычны аналіз ідэалогіі і тых яе формаў, якія злучаны з т.зв. мяккай сілай РФ у дачыненні да Беларусі і іншых постсавецкіх краін;
- ✓ праводзіць рэгулярны маніторынг метадаў і інстытуцыянальных форм прасоўвання ідэялогіі “рускага свету” ў Беларусі, скласці «чорны спіс» тых інстытутаў, якія ажыццяўляюць адукацыйную і культурніцкую каланіялізацыю Беларусі;
- ✓ распрацоўваць формы і метады працістаяння распаўсюду ідэялогіі “рускага свету” як на індывідуальным, так і на інстытуцыйным узроўні, як знутры краіны, так і па-за яе межамі – у шчыльным супрацоўніцтве з еўрапейскімі калегамі і пад лёзунгам «*Беларуская і агульнаеўрапейская ментальная бяспека*»;
- ✓ рабіць тэму каляніялізацыі і «акупацыі будучыні» Беларусі і Еўропы рэгулярнай тэмай ў медыя, каб дагрукацца да свядомасці больш шырокай грамадзкасці і дапамагчы зразумець узровень пагрозы для нацыянальнай ідэнтычнасці і існавання суверэннай дзяржамы Беларусі ў сувязі з еўрапейскай бяспекай;
- ✓ распрацоўваць адукацыйныя праграмы і курсы, якія маглі б спрыяць развіццю ў шырокай грамадскасці больш высокай рэзістэнтнасці да ідэялогіі “рускага свету”, такіх як “Крытычнае мысленне”, “Крытыка ідэялогіі” і г.д.

3) **Прапановы да вырашэння праблемы дэградацыі, ідэалагізацыі і мілітарызацыя сістэмы адукацыі і навукі Беларусі:**

- ✓ наладзіць сістэматычную дапамогу рэпрасаваным навучэнцам (студэнтам, школьнікам) і выкладчыкам праз стварэнне *Фонда акадэмічнай дапамогі* і *Службы акадэмічнай дапамогі* (па пошуку працы і сацыялізацыі);
- ✓ унутры краіны зрабіць стаўку на сабатаж і імітацыю: інэрцыя і рыгіднасць інстытутаў адукацыі, кансерватыўнасць акадэмічных супольнасцяў будзе ўскладняць і сабатаваць беларуска-расійскую мілітарызацыю;
- ✓ спрыяць развіццю адукацыйных і навуковых праектаў беларускай дыяспары у сферы нефармальнай і фармальнай адукацыі ў фарматах онлайн і афлайн;
- ✓ спрыяць развіццю створаных дыяспарай органаў грамадзянскага прадстаўніцтва і самакіравання ў галіне адукацыі і навукі: Беларуская асацыяцыя адукацыі і навукі і інш.;
- ✓ падтрымліваць і спрыяць дзейнасці праваабаронцаў (БХК) па маніторынгу захавання і парушэння правоў грамадзян на адукацыю ў Беларусі;
- ✓ падтрымліваць і спрыяць дзейнасці незалежных экспертаў па аналізу заходнееўрапейскага і сусветнага досведу у сферы адукацыйнай палітыкі, распрацоўцы канцэпцый і праектаў рэформ у галіне адукацыі і навукі.

4) **Прапановы па вырашэнню праблемы фінансавай і палітычнай уразлівасці, раз’яднанасці і дэінстытуцыяналізаванасці навукова-адукацыйных праектаў дыяспары:**

- ✓ стварыць фонд доўгатэрміновай падтрымкі найбольш істотных і перспектыўных адукацына-навуковых праектаў (што патрабуе: вызначэнне арганізацыі, на основе якой можна было б стварыць такі фонд, шырокай кампаніі па падтрымке беладукацыі і навукі, эвалюацыі праектаў, стварэнне спіса прыярытэтаў);
- ✓ перманентна адсочваць і адвакаваць інтарэсы беларускай навукова-адукацыйнай супольнасці ў адпаведных краінах (што патрабуе стварэнне інфраструктуры – акцентацыя гэтага накірунку як істотнага ў дзейнасці амбасадораў і стварэнне прадстаўнікоў па адукацыі і навуке);
- ✓ сістэматычна дапамагаць арганізатарам і аўтарам адукацыйна-навуковых праектаў ў набыцці ведаў і навыкаў кіравання і стратэгічнага планавання ва умоваў невызначанасці (курсы, майстар-клясы і г.д.);
- ✓ дзеля развіцця узаемадзеяння і партнэрства трэба уплываць на донарскіе праграмы (кшталту SALT) і спрыяць развіццю партнэрскага фармата (заяўка мусіць падавацца у кааперацыі);
- ✓ спрыяць кааперацыі і інстытуцыяналізацыі новых і старых праектаў - гэта падвышае шансы на фінансаванне і надае большай упэўненасці ў будучыні.

## План рэалізацыі

**Пакрокавая рэалізацыя прапановы для вырашэння першай праблемы прадугледжвае:**

1) распрацоўку аргументацыі і канцэпта альтэрнатыўнага прадстаўніцтва беларускай адукацыі і навукі на міжнародным узроўні ад імя грамадзянскай супольнасці і дэмакратычнага руха;

2) лабіяванне канцэпта альтэрнатыўнага прадстаўніцтва беларускай адукацыі і навукі на міжнародным узроўні праз найбольш вядомыя і уплывовыя палітічныя структуры, менавіта: Офіс Св. Ціханоўскай, АПК і Каардынацыйную Раду;

3) узгадненне дзеянняў усіх актараў і палітычных сіл згодна з канцэптам альтэрнатыўнага прадстаўніцтва;

4) папулярызацыя у незалежных масс-медыя канцэпта альтэрнатыўнага прадстаўніцтва беларускай адукацыі і навукі на міжнародным узроўні ад імя грамадзянскай супольнасці і дэмакратычнага руха.

**Пакрокавая рэалізацыя прапановы для вырашэння другой праблемы прадугледжвае:**

1) сістэматычны маніторынг метадаў і інстытуцыянальных форм прасоўвання ідэялогіі “рускага свету” ў Беларусі;
2) складанне «чорнага спісу» тых інстытутаў, якія ажыцця̆уляюць адукацыйную і навуковую каланіялізацыю Беларусі, апублічванне “чорнага спіса” у незалежных мас-медыя і ажыццяўленне ціска на інстытуты, якія ажыццяўляюць адукацыйную і навуковую каланіялізацыю Беларусі (праз увядзенне санкцый і г.д.) ;
3) распрацоўка адукацыйна-навуковага кантэнта з крытычным аналізам ідэалогіі і тых яе формаў, якія злучаны з т.зв. мяккай сілай РФ у дачыненні да Беларусі і іншых постсавецкіх краін;
4) распрацоўка адукацыйна-навуковага кантэнта, які падвышае рэзістэнтнасць грамадскасці унутры краіны і за яе межамі да ідэялогіі “рускага свету”, такіх як “Крытычнае мысленне”, “Крытыка ідэялогіі” і г.д.;
5) лабіяванне адкрыцця асобнага накірунку фінансавай падтрымкі адукацыйна-навуковых праектаў пад агульнай назвай «*Беларуская і агульнаеўрапейская ментальная бяспека*».

**Пакрокавая рэалізацыя прапановы для вырашэння трэцяй і чацвертай праблемы прадугледжвае:**

1) арганізацыю канферэнцыі беларускіх аудакатараў і навукоўцаў, а таксама прадстаўнікоў палітычных дэмакратычных сіл і грамадскіх арганізацый з мэтай абмеркавання актуальнай сітуацыі у беларускай адукацыі і навуке ў эміграцыі;
2) стварэнне рашэннем канферэнцыі *Беларускага фонда акадэмічнай дапамогі* (на падставе краудфандынгу і ахвярванняў беларускіх бізнэсоўцаў), у місію якога уваходзіць: а) падтрымка прадстаўнікоў навуковай і акадэмічнай супольнасці, якія апынуліся ва уразлівым стане і б) падтрымка найбольш істотных і перспектыўных адукацыйна-навуковых праектаў;
3) рашэннем канферэнцыі стварыць адзіную *Службу акадэмічнай дапамогі* (па інфармацыйна-кансультацыйнай дапамоге ў пошуку працы і сацыялізацыі прадстаўнікоў акадэмічнай супольнасці, якія страцілі працу па палітычных матывах);
4) падрыхтьаваць да канферэнцыі а) дыягназ актуальнага стана адукацыйна-навуковых праектаў і ініцыятыў ў эміграцыі; б) План прапаноў развіцця беларускай адукацыі і навукі ў эміграцыі на каротка- (1 год), сярэдне- (2-3 гады) і доўгатэрміновы (5-10 гадоў) перыяд;
5) абмеркаваць на канферэнцыі і прыняць (зацвердзіць) план развіцця беларускай адукацыі і навукі ў эміграцыі, падпісаць грамадзянскую дамову аб яго выкананні (з размеркаваннем зон адказнасці).

## Рызыкі, перашкоды і меры па іх пераадоленню

Асноўныя рызыкі і перашкоды звязаны з экстраардынарнымі умовамі існавання як унутры краіны, так і у эміграцыі, фокусам на выжыванні “тут і цяпер”, жорсткімі рэпрэсіямі унутры краіны і вострым дэфіцытам фінансавай падтрымкі у эміграцыі, агульным зніжэннем матывацыі удзельнічаць у праектах па падтрымке беларускай

адукацыі і навукі на валантэрскіх падставах, звальненнем, даўншыфтынгам і сыходам з прафесіі высокакваліфікаваных выкладчыкаў і вучоных унутры краіны і у эміграцыі. Кумулятыўным эфектам усіх гэтых чыннікаў стала дамінаванне тэндэнцыяў апатыі унутры краіны і асіміляцыі беларускіх эмігранта(к)ў у краіны знаходжання, а не праца на будучыню і не інвеставанне сваіх сіл ў “новую дэмакратычную Беларусь”.
Усе гэтыя рызыкі і перашкоды могуць быць паменьшаныя дзякуючы:
**1)** прыярэтызацыі адукацыйна-навуковай павесткі як асноўнага сімбалічнага і чалавечага капітала дэмакратычных сіл у эміграцыі;
**2)** наяўнасці салідарнасці у прадстаўнікоў беларускай навуковай і акадэмічнай супольнасці, палітычнай волі у асноўных палітычных актараў і прадстаўнікоў вядучых грамадскіх супольнасцяў;
**3)** наяўнасці яснага і пераканаўчага Плана развіцця беларускай адукацыі і навукі ў эміграцыі;
**4)** распрацоўке Дарожнай мапы дзеянняў па рэалізацыі Плана развіцця беларускай адукацыі і навукі ў эміграцыі;
**5)** стварэню групы фандрайзераў, якая дапаможа знайсці сродкі фінансавання для рэалізацыі Плана (як мінімум у кароткатэрміновы перыяд 1-2 года);
**6)** падбору эфектыўнай каманды менеджэраў працэса рэалізацыі Дарожнай мапы і Плана;
**7)** яснаму размеркаванню зон адказнасці выканаўцаў Дарожнай мапы і Плана і стварэнню пэўнай сістэмы матывацыяў (у тым ліку фінансавых).

## Крыніцы

Арганізацыі, інстытуты, ThinkTanks з павесткай беларускай адукацыі і навукі:

- Банк Ідэй. Вебстаронка: https://www.ideasbank.vision/be
- Беларусская асацыяцыя адукацыі і навукі. Вебстаронка: https://beledusci.org
- Задзіночанне беларускіх студэнтаў. Вебстаронка: https://zbsunion.org
- Інстытут палітычных даследванняў “Палітычная сфера”. Вебстаронка: https://palityka.org
- Інстытут развіцця развіцця і сацыяльнага рынку ў Беларусі і Усходняй Еўропе (англ.: Institute for development and social market in Belarus and Eastern Europe). Вебстаронка: https://idsmbee.org
- Офіс Святланы Ціханоўскай. Вебстаронка: https://tsikhanouskaya.org/ru/ofis.html
- Офіс па адукацыі для Новай Беларусі. Кропка доступа: https://www.facebook.com/EduOfficeForNewBelarus
- Прадстаўніцтва па нацыянальным адраджэнні. Адукацыя і навука. Вебстаронка: https://revivalbelarus.org/adukacyja-i-navuka/
- The International Strategic Action Network for Security (iSANS). Точка доступа: https://isans.org/ru/education/education-monitoring
- Цэнтр Беларускай Салідарнасці. Кропка доступа: https://www.facebook.com/CBSwarsaw

Фонды, праграмы і арганізацыі фінансавай падтрымкі беларускай адукацыі і навукі:

- EU4Belarus — SALT (Support for Advanced Learning and Training). Вебстаронка: https://eu4belarus.info/home-en/

- Праграма імя Кастуся Каліноўскага (Польшча). Вебстаронка: https://studium.uw.edu.pl/program-im-kalinowskiego/nabor-do-programu-im-k-kalinowskiego/
- Платформа EdTech4BY. Вебстаронка: https://byedtech.eu/be/
- Стыпендыя імя Стэфана Банаха (Польшча). Вебстаронка: https://nawa.gov.pl/en/students/foreign-students/the-banach-scholarship-programme
- Вышаградскі фонд (Visegrad Scholarship Program). Вебстаронка: https://www.visegradfund.org/scholarships
- Праграма Philipp Schwartz Initiative (Германія). Вебстаронка: https://www.humboldt-foundation.de/en/apply/sponsorship-programmes/philipp-schwartz-initiative
- Scholars at Risk (SAR). Вебстаронка: https://www.scholarsatrisk.org
- Chances for Science (Германія). Вебстаронка: https://www.chance-for-science.eu/index.php
- Science at Risk. Вебстаронка: https://science-at-risk.org
- Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт (ЕГУ, Вільнюс). Вебстаронка: https://www.ehuniversity.lt
- Ініцыятыва Bright Belarus. Вебстаронка: https://brightbelarus.com

Даследванні, маніторынгі, праграмы, праекты:

- Асвета. Дайджест офиса Светланы Тихановской по вопросам образования и науки. Точка доступа: https://beledusci.org/analitychnyya-materyyaly/
- За Беларусь. Рэанімацыйны пакет рэформ. Кропка доступа: https://www.zabelarus.info
- Базавае даследванне адукацыі Беларусі у межах праекта «Васьміног» (2023): https://idsmbee.org/dasledavanni#!/tfeeds/281745351021/c/Адукацыя
- Беларусское образование на пути изменений. 30 лет политики в сфере образования Беларуси (1991-2021). Вильнюс 2021. Точка доступа: https://beledusci.org/wp-content/uploads/2025/11/30-let-politiki-belarus.pdf
- Беларуская адукацыя на шляху перамен. Дарожная карта па падрыхтоўцы рэформ адукацыі (2021).
- Беларуская адукацыя на шляху перамен. Лічбавая кампетэнтнасць у новай Беларусі (2021).
- Беларуская адукацыя на шляху перамен. Адукацыйныя ініцыятывы Беларусі: мапа ўзаемадзеянняў (2021). Кропка доступа: https://beledusci.org/wp-content/uploads/2025/11/adukaczyjnyya-iniczyyatyvy-full.pdf
- Беларуская адукацыя на шляху перамен. Параўнальны агляд адукацыйных палітык у краінах Еўропы (2021).
- Беларуская адукацыя на шляху перамен. Стварэнне інклюзіўнага адукацыйнага асяроддзя ў школах Беларусі: арыенціры (2021).
- Беларуская адукацыя на шляху перамен. Распрацоўка стратэгіі навучання на працягу ўсяго жыцця: check list (2021).
- Двухмоўнае аднамоўе. Моўная палітыка ў Беларусі: стан, тэндэнцыі і перспектывы. Кропка доступа:https://www.ideasbank.vision/ru/projects/12
- Дети без будущего. Милитаризация детства в Беларуси. Доклад BELPOL и НАУ (2025). Точка доступа: https://belpol.pro/deti-bez-budushhego-doklad-belpol-i-nau/
- Демократизация общего среднего образования: проект Офиса Светланы Тихановской при участии Объединенного Переходного Кабинета. Кропка

доступа: https://tsikhanouskaya.org/ru/concepts-of-reforms/demokratizaciya-obshhego-srednego-obrazovaniya-proekt-ofisa-svetlany-tixanovskoj-pri-uchastii-obedinennogo-perexodnogo-kabineta

- Дорожная карта демократизации высшего образования Беларуси на период 50-100-500 дней. Кропка доступа: https://tsikhanouskaya.org/ru/concepts-of-reforms/dorozhnaya-karta-demokratizacii-vysshego-obrazovaniya-belarusi-na-period-50-100-500-dnej
- Казакевіч А., Ганчарэнка К. і інш. Беларускія студэнты ў Еўропе: колькасць, краіны, дынаміка (2026). Кропка доступа: https://palityka.org/2026/04/bjelaruskija-studenty-u-jeuropje-kolkasc-krainy-dynamika/
- Лаврухин А. Правовые возможности и практическая реализация студенческого представительства и самоуправления в РБ, Украине, России и Германии. Analytical material for the Association of Students of Belarus. 2021.
- Лаврухин А. Реформирование системы образования в Республике Беларусь. Новая Беларусь. Кропка доступа: https://newbel.info
- Лаврухин А. Анализ и состояние Болонского процесса в Беларуси. Analytical material of the Office of Education for New Belarus. Vilnius, 2021.
- Лаврухин А. Управление образованием: от аномальной бюрократизации – к децентрированной и прозрачной системе. Analytical material of the Office of Education for New Belarus. Vilnius, 2021.
- Лаврухин А. Деидеологизация образования Республики Беларусь: когда и как это возможно. Analytical material of the Office of Education for New Belarus. Vilnius, 2021.
- Лаврухин А. Анализ существующей образовательной политики и нормативно-правовых актов, регулирующих институциональную автономию и самоуправление в образовательных учреждениях Беларуси, России и развитых стран мира. Analytical material for the Institute of Development and Social Market in Belarus and Eastern Europe. Vilnius, 2022. Link to the publication: https://idsmbee.org/dasliedavanni/adukacyja/1445-2/
- Лаврухин А. Реформирование системы образования Беларуси в направлении расширения институциональной автономии и развития самоуправления образовательных учреждений. Analytical material for the Institute of Development and Social Market in Belarus and Eastern Europe. Vilnius, 2022. Link to the publication: https://idsmbee.org/dasliedavanni/adukacyja/1445-2/
- Лаврухин А. Дорожная карта реформ системы образования Беларуси в направлении расширения институциональной автономии и развития самоуправления образовательных учреждений. Analytical material for the Institute of Development and Social Market in Belarus and Eastern Europe. Vilnius, 2022. Link to the publication: https://idsmbee.org/dasliedavanni/adukacyja/1445-2/
- Лаврухин А. Система повышения квалификации учителей в Беларуси: эволюция, актуальное состояние, проблемы и направления реформирования (2023). Точка доступа: https://idsmbee.org/dasledavanni#!/tfeeds/281745351021/c/Адукацыя
- Лаврухин А. Опыт реформ в системе образования Литовской Республики: уроки для Беларуси (2025): https://idsmbee.org/tpost/cma84gder1-opit-reform-v-sisteme-obrazovaniya-litov
- Милитаризация системы образования Беларуси. Октябрь 2025. The International Strategic Action Network for Security (iSANS). Точка доступа: https://isans.org/wp-content/uploads/2025/11/militarizacziya_sistemy_obrazovaniya_belarusi_2021_2025.pdf

- Национальный индекс прав человека в Беларуси: https://index.belhelcom.org
- Образование: Мониторинг. The International Strategic Action Network for Security (iSANS). Точка доступа: https://isans.org/ru/education/education-monitoring
- Обучение на протяжении всей жизни и социальное измерение высшего образования по итогам 2021 года. Analytical material for the Public Bologna Committee. Minsk, 2022.
- Офіс па адукацыі для Новай Беларусі. Выбарнасць рэктараў установ вышэйшай адукацыі. Палажэнні аб Савеце і выбарах (2021).
- Офіс па адукацыі для Новай Беларусі. Аналіз стану Балонскага працэсу ў Беларусі (2021).
- О чём говорит PISA? Рекомендации для системы образования Беларуси: https://www.ideasbank.vision/ru/projects/24
- «Русский мир» як інфраструктура гібрыднага уплыву ў Беларусі. Маніторынгавы аналітычны дакумент, снежань 2025 — травень 2026. Кропка доступа: https://idsmbee.org/tpost/6g5lmh2he1-russkii-mir-yak-nfrastruktura-gbridnaga